# ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА

**Г. Д. КРУПЕНЧЫК,**
настаўніца вышэйшай катэгорыі ДУА «Гімназія-каледж мастацтваў г. Маладзечна»

*Да 120-годдзя з дня нараджэння Кузьмы Чорнага*

# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ГУЛЬНЯ «РАЗУМНІКІ І РАЗУМНІЦЫ» па аповесці Кузьмы Чорнага «НАСЦЕЧКА» для вучняў VI класа

**Прапанаваны матэрыял можа быць выкарыстаны на падагульняльным уроку па аповесці Кузьмы Чорнага «Насцечка» (VI клас). З дапамогай літаратурнай гульні настаўнік правярае веданне вучнямі зместу, герояў твора. Заданні садзейнічаюць развіццю пазнавальнай актыўнасці, камунікатыўнай культуры, умення працаваць у камандзе, спрыяюць заахвочванню да чытання мастацкай літаратуры.**







Прыклад афармлення пытання




**І тур. «Чые адчуванні?».**

**10.** Увесь свет вінаваты перад ім, і толькі ён адзін нявінны і цярплівы. *(Серж.)*

**20.** «Вельмі моцна пахла лісце на дрэвах, і ад гэтага мне было яшчэ цяжэй. Я гэты пах адчуваў як нешта такое, што для мяне ўжо скора скончыцца назаўсёды. Больш як калі-небудзь у сваім жыцці, я ў гэты момант адчуваў, якое шчасце жыць на свеце». *(Бацька Сержа.)*

**30.** «Мы так узрадаваліся адзін аднаму, што абняліся проста сярод вуліцы, не зважаючы на тое, што на нас азіраюцца людзі». *(Закрэўскі і бацька Сержа.)*

**40.** «Спадылба пазіраў на знаёмых і ў душы сваёй праклінаў тую часіну, калі ён сюды прыйшоў». *(Серж.)*

**50.** «У яго задрыжалі губы і пачырванелі вочы, але ён адразу ж справіўся з сабой і, каб не дапусціць да якіх бы там ні было непрыемнасцей, сказаў...» *(Закрэўскі.)*

**II тур. «Пазнай героя».**

**10.** «І ў паходцы яго, і ў выразе твару было нешта цвёрдае. Здавалася, што чалавек нечым ганарыцца». *(Закрэўскі.)*

**20.** «Ніводнай мінуты не мог устояць на месцы». *(Серж.)*

**30.** «Быў заўсёды заняты працай, працаваў ад цямна да цямна». *(Бацька Сержа.)*

**40.** «Ён у дзесяць разоў яшчэ ад сябе дадасць таго, чаго зусім не было». *(Мішка.)*

**50.** «Заўсёды ўносіла ў гульні весялосць». *(Насцечка.)*

**III тур. «Лічбы».**

**10.** У якім класе вучыліся Серж і Насцечка? *(У пятым класе.)*

**20.** Які быў нумар школы, дзе вучыліся Серж і Насцечка? *(Нумар 20.)*

**30.** Колькі поўных гадоў было Насцечцы? *(12 гадоў.)*

**40.** Колькі рублёў патрабаваў аднойчы Серж у сваіх бацькоў? *(Пяць рублёў.)*

**50.** Колькі паверхаў было ў доме, дзе жылі Закрэўскія? *(Тры паверхі.)*

**IV тур. «Чые словы?»**

**10.** «А ўвосень — які лес прыгожы! На полі мокра, пуста, вецер ходзіць, а ў лесе хвоі густа стаяць; зелена, зацішна, свежа і толькі ўверсе вецер у хвоях — ш-ш-ш... А ядловец — зялёны стаіць пад якім-небудзь вялікім дрэвам. А на крушынавым ці на арэхавым кусце астанецца часамі адзін жоўты лісток, і так на яго слаўна глядзець». Хто так апісваў лес і гаварыў пра сваю любоў да яго? *(Насцечка.)*

**20.** «Стары чорт! Ты вечарам стаіш на вуліцы і на месяц глядзіш, як дурань. Ты думаеш, я цябе баюся?» *(Серж.)*

**30.** «Трэба было раней думаць пра гэта, а то ты патураў усім яго капрызам, а цяпер агледзеўся, што з яго выйшаў хуліган». *(Маці Сержа.)*

**40.** «Калі я быў малы, я любіў такі час, калі блізіцца зіма. Але я і ўсялякі час у годзе любіў». *(Бацька Сержа.)*

**50.** «Дружба — вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць, чуеце, дзяўчаткі? Дружба робіць вялікія справы. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць. Шануйце, дзеці, дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека». *(Насціна мама.)*

**V тур. «Дапоўніце».**

**10.** Сказаў Насцін дзед: «Гэта і добра, няхай пабудзе ..., паспакайнее» *(сам з сабой)*.

**20.** «Добры дзень вам, дзяўчаткі,— сказала мама.— Хоць я вас і першы раз бачу, але ўжо люблю вас за тое, што вы ...» *(дружыце з маёй Насцечкай)*.

**30.** «Мая мама прыязджае. І ведаеце што? Яна ўжо раней пісала, што мае ...» *(патэфон)*.

**40.** «Ой, дзевачкі! — радасна крыкнула Насцечка і, рассыпаўшы на падлогу жменю гароху, кінулася к дзвярам, каб адчыніць іх. Увайшлі ...» *(тры дзяўчынкі — Рая, Фаня і Надзя)*.

**50.** «Гэта мы яго давялі да гэтага. Я ж бачу,— ён нікога не паважае, ...» *(апроч самога сябе)*.

**Н. М. ГАЛУШКА,**
настаўніца вышэйшай катэгорыі гімназіі № 1 г. Барысава

# У ПАЭЗІІ ЖАНОЧАЕ АБЛІЧЧА

## Сцэнарый літаратурнага свята для вучняў IX—XI класаў

Мэта: садзейнічаць развіццю эстэтычнага густу, фарміраванню чытацкай і камунікатыўнай культуры, падтрымліваць цікавасць да беларускай паэзіі, літаратурнай спадчыны.

Абсталяванне: кніжная выстава, аўдыязапісы музыкі і песень, тэатральны рэквізіт для інсцэніровак.

### Ход мерапрыемства

Першы вядучы. Паважаныя сябры! Шаноўныя госці! Вітаем вас на пасяджэнні клуба «Спадчына». Праца нашага клуба ў гэтым навучальным годзе прысвечана ўшанаванню памяці і папулярызацыі творчасці беларускіх пісьменніц і паэтак.